2. Горбатенко, И. Археологи ищут остатки укреплений древнего города на берегах реки Менка [Электронный ресурс] / И. Горбатенко. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/nachalo-istorii-arheologi.html. – Дата доступа: 14.09.2023.

3. Загорульский, Э. М. Археология Беларуси / Э. М. Загорульский. – Минск: Высшая школа, 1965. – 227 с.

4. Тарасенко, В. Р. Древний Минск (по письменным источникам и данным археологических раскопок 1945–1951 гг.) [Электронный ресурс] / В. Р. Тарасенко // Материалы по археологии БССР. – Минск, 1957. – Т. 1. – С. 182–257. – Режим доступа: https://pawet.net/library/history/bel_history/_rarch/007/1/%D0%94%D1%80%D0%B5%D0%B2%D0%BD%D0%B8%D0%B9_%D0%9C%D0%B8%D0%BD%D1%81%D0%BA.html. – Дата доступа: 15.09.2023.

5. Штыхов, Г. В. Города Полоцкой земли (IX–XIII в.) / Г. В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1978. – 160 с.

**Научный руководитель** – кандидат исторических наук, доцент, доцент кафедры всеобщей и славянской истории ГрГУ имени Янки Купалы Мелешко Е. И.

УДК 903.59

# Анализ антропологических материалов с околиц д. Белево (Гродненский район)

**КАСПЕР**
**Никита Сергеевич**



*Студент 4 курса*
*ГрГУ имени Янки Купалы*
*nikitakasper127@gmail.com*

*Аннотация.* Данная статья посвящена анализу антропологического материала, который был собран на грунтовом могильнике Белево (Гродненский район), обнаруженном в ходе археологических разведок в 2004 году.

*Ключевые слова:* антропология, разведка, керамика, зубы, ребра.

Грунтовый могильник Белево располагается на север от одноименной деревни, на территории Индурского с/с Гродненского района. Памятник был открыт в 2004 году в ходе проведения археологической разведки под руководством на тот момент, старшего преподавателя Гродненского государственного университета имени Янки Купалы, Юрковец Ю. В. Разведка имела спасательную функцию, так как на территории археологического памятника, без информирования археологов, началось строительство коровника. О происходящем на памятнике сообщил директор Луцковлянского музея Козаков В. С. Могильник располагается примерно в 1 км 300 м на север от деревни Белево, в поле, на возвышенности 2 м, его размеры 52 х 57 х 55 х 37 м. Местные жители называют памятник, "Шведская могила" (Рисунок 1) [3].



**Рисунок 1.** Месторасположение могильника Белево.

В ходе проведения работ, было выявлено, что памятник находится в стадии полного разрушения. По предположениям археологов, в скором времени памятник мог быть полностью утерян. Во время проведения разведки было обнаружено: девять фрагментов человеческих костей, один кованый гвоздь, один фрагмент венчика гончарного горшка в форме чугунка и один

фрагмент стенки гончарного горшка. По полученным в ходе археологических работ материалам, можно датировать данный памятник поздним средневековьем.

Среди найденных антропологических материалов 8 костей принадлежат к осевому скелету, и 1 кость – к краниологическому.

**Осевой скелет.** Сохранились три части ребер, которые по своей структуре относятся к отделу истинных рёбер. Один позвоночник шейного отдела, в хорошей сохранности. Также сохранилась верхняя часть бедренной кости левой ноги (Рисунок 2), а также часть суставного отдела округлой формы [1].



**Рисунок 2.** Часть берцовой кости. Фото Каспер Н.С.

Определить пол и возраст индивида по сохранившимся материалам не представляется возможным, в связи с отсутствием основных морфометрических данных.

**Краниологический скелет.** Данный материал представлен одним куском нижней левой челюсти, в котором сохранились два коренных зуба (Рисунок 3). В ходе проведённого исследования было выявлено, что при жизни зубы индивида были подвержены бруксизму (в ранней стадии). Также, на сохранившемся куске челюсти, были выявлены следы удаления зуба при жизни индивида [2].



**Рисунок 3.** Часть левой нижней челюсти. Фото Каспер Н.С.

Определить пол и возраст по краниологическому скелету также невозможно, так как отсутствуют основные морфологические элементы.

**Керамика.** В ходе проведения археологических работ была обнаружена керамика XVII–XVIII веков. Был найден один фрагмент венчика гончарного горшка (Рисунок 4), а также один фрагмент стенки, по

предположениям, всё того же горшка [3].




**Рисунок 4.** Часть венчика, найденного на могильнике Белево. Фото Каспер Н.С.

На сегодняшний день, на месте грунтового могильника располагается коровник. А материалы, которые были получены в ходе археологической разведки, не могут показать нам полную картину того, насколько большим был данный могильник. По полученным антропологическим материалам мы не можем определить пол и возраст индивидов, так как морфологические особенности, по которым определяется данная информация, отсутствуют. Перспектив исследования данного памятника на сегодняшний момент нет, так как он находится в разрушенном состоянии.

**Список источников и литературы**

1. Алексеев, В. П. Остеометрия: Методика антропол. исследований / В. П. Алексеев. – АН СССР. Ин-т этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая. – Москва : Наука, 1966. – 251 с.

2. Алексеев, В. П. Краниометрия. Методика антропологических исследований / В. П. Алексеев, Г. Ф. Дебец. – М. : Наука, 1964. – 127 с.

3. Юркавец, Ю. В. Справаздача аб археалагічных палявых даследаваннях у Гродзенскім і Ваўкавыскім раёнах Гродзенскай вобласці ў 2004 годзе / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 2203. – 9 с., 3 с. сп. іл., 44 іл.

**Навуковы кіраўнік** – магістр гістарычных навук, старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін ГрДУ імя Янкі Купалы Гаршкоў А. Д.

# АРХЕАЛОГІЯ НОВАГА І НАВЕЙШАГА ЧАСОЎ

**УДК 902(476.6)“19”**

## Дзесяць знаходак з гарышча будынка на зав. Тэлеграфны, 2, г. Гродна

**ГАЦКО**
**Ягор Уладзіміравіч**



*Аспірант ГрДУ імя Янкі Купалы, метадыст ГАЦТіК*
igorichg@mail.ru

*Анатацыя.* Дадзены артыкул апісвае дзесяць знаходак, якія былі выяўлены ў жніўні-лістападзе 2023 г. падчас прасейвання земляной падлогі гарышча будынка па адрасе: завулак Тэлеграфны, 2, г. Гродна. Даецца апісанне прадметаў і іх фотаздымкі.

Дадзеныя знаходкі прадстаўляюць навуковы інтарэс, бо дазваляюць дапоўніць даследаванні па гісторыі будынка і горада ў цэлым.

*Ключавыя словы:* знаходка, гарышча, будынак, прытулак.

**Уводзіны.** Гродзенскія будынкі захоўваюць шмат невядомага і недаследаванага. І здараецца так, што выпадковая знаходка з’яўляецца каталізатарам для правядзення метадычнай працы па пошуку іншых знаходак, і дазваляе паглядзець на будынак ужо зусім іншым вокам.

Па адрасе завулак Тэлеграфны, 2 мы можам знайсці светла-зялёны, цагляны, 2-х павярховы будынак з двума 1-на павярховымі, драўлянымі прыбудовамі зялёнага колеру (Малюнак 1). Ва ўнутраным двары маецца драўляная мансарда. На сённяшні дзень забудова вывучана даволі павярхоўна [1, с. 346–347].



**Малюнак 1.** Фасад будынка на завулку Тэлеграфны, 2, г. Гродна. Фотаздымак аўтара. Працы праходзяць на гарышчы правай драўлянай прыбудовы.

Паводле свайго тэхнічнага пашпарта, будынак быў узведзены ў 1880 г. [10, с. 3]. За гэты час у ім знаходзіліся розныя ўстановы. З 1880(?) па 1915 гг. тут быў прытулак Гродзенскага дабрачыннага таварыства (далей – ГДТ), з 1921 па 1939(?) гг. – знаходзілася прафесійная жаночая школа (Państwowa szkoła zawodowa żeńska w Grodnie), якая арэндвала будынак у Польскага дабрачыннага таварыства (далей – ПДТ), месціўся

тут і дзіцячы дом № 1 (з верасня 1944 па верасень 1960 гг.). З восені 1960 г. будынак займае Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гродзенскі абласны цэнтр турызму і краязнаўства” (далей – ДУА “ГАЦТіК”) [3, с. 270; 8, арк. 11; 15]. Установа займаецца правядзеннем экскурсій, арганізацыяй гурткоў па інтарэсах для школьнікаў, а таксама праводзіць турыстычныя спаборніцтвы.

У жніўні 2023 г. упраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама, напярэдадні новага вучэбнага году, дала рэкамендацыю ДУА “ГАЦТіК” аб прывядзенні ў парадак гарышча будынка. І пры выкананні гэтай рэкамендацыі, прыбіральшчыцай установы была зроблена першая знаходка – металічная шыльда міжваеннага часу.

Знойдзеная шыльда стала каталізатарам правядзення больш метадычнага пошуку артэфактаў на гарышчы. А паколькі падлога была пасыпана слоем пяску (прыкладна 10 см), то было прынята рашэнне прасеяць праз сіта гэты пясок. У выніку было знойдзена шмат матэрыялаў: кавалкі глінянага посуду, паперы, дзве аптэчныя бутэлечкі, каталіцкі медальён, савецкія манеты, папіросныя недакуркі і інш. Мы прадставім дзесяць найбольш цікавых артэфактаў, знойдзеных на гарышчы на працягу жніўня-лістапада 2023 г.

Мэта нашага артыкула: зрабіць апісанне дадзеных знаходак, вызначыць іх памеры, па-магчымасці даведацца, дзе і калі быў зроблены той ці іншы артэфакт, праанілізаваць, якім чынам яны маглі быць звязаныя з вышэйадзначаным будынкам.




**Малюнак 2.** Шыльда прытулку Польскага дабрачыннага таварыства, міжваенны час. Фотаздымак аўтара.

**Асноўная частка.** *Металічная шыльда* (Малюнак 2). Мае прастакутную форму, памерам 17 х 14 см. Пафарбавана ў чорны колер. У верхняй частцы маюцца тры адтуліны дыяметрам па 0,5 см кожная. На шыльдзе ёсць надпіс жоўтымі літарамі на польскай мове: “L. Polskie 143 / T-wo Dobrocz. w Grodnie / OCHRONKA / Imię i naz.... / Data urodz.... / Akt...” (Польскае дабрачыннае таварыства ў Гродне. Прытулак. Імя і прозвішча. Дата нараджэння. Акт). Верхняя і ніжняя часткі шыльды

пакрыты карозіяй, цэнтр – у меньшай ступені. Дадзеная шыльда зроблена ў перыяд 1921–1939 гг., калі Гродна знаходзіўся ў складзе Польшчы. Тое, што ПДТ валодала гэтым будынкам, пацвярджаюць мапы горада і літаратура таго перыяду, а таксама, архіўныя крыніцы [12, s. 20; 14, s. 113; 6, арк. 8].

*Два папіросныя недакуркі, пачатак XX ст.* (Малюнак 3). Левы недакурак мае даўжыню 5,5 см. Ёсць надпіс на рускай мове дарэвалюцыйнага правапісу чырванаватага колеру: “ЮБИЛЕЙНЫЯ / … 2 пѣх. вятск. п. / 1803–1903 / Шерешевскій / Гродно”. Правы недакурак мае даўжыню каля 3 см з надпісам на рускай мове дарэвалюцыйнага правапісу чорнага колеру: “АГАНЪ / Вильнѣ”.




**Малюнак 3.** Два недакуркі, пач. XX ст., знойдзеныя Жабінскім Паўлам. Левы – з гродзенскай тытунёвай фабрыкі Шэрэшэўскага, правы – з віленскай тытунёвай фабрыкі. Фотаздымак аўтара.

З гэтых знаходак можна зрабіць наступныя высновы. Па-першае, паводле надпіса і датыроўкі – недакуркам ад 108 да 120 гадоў. Па-другое, тытунёвая фабрыка Шэрэшэўскага, якая ў той перыяд знаходзілася на вул. Маставой (сёння – будынак па вул. Маставая, 31), выпускала папіросы не толькі для цывільных, але і спецыяльныя для вайскоўцаў з надпісам іх вайсковага злучэння. Мы ўпэўненыя, што левая папіроса была з серыі, якая выпускалася да 100-годдзя заснавання 102-га пяхотнага Вяцкага палка. Доказам гэтага служыць абрэвіятура: “пѣх. вятск. п.” – г.зн. “пехотный Вятский полк” і дата “1803”, якая з’яўлялася афіцыйным годам заснавання дадзенага падраздзялення [16]. Полк у пач. XX ст. месціўся ў казармах па вул. Пецярбургскай і вул. Вяцкай (сёння – вул. Чырвонаармейская, 11 і вул. Шчорса, 2, 4 і 8, адпаведна) [7, арк. 1]. На сённяшні дзень комплекс казармаў на вул. Чырвонаармейскай захаваўся ў добрым стане, бо зараз там месціцца полк унутраных войскаў МУС РБ. А казармы па вул. Шчорса, 2 і 4 – “рэстаўруюць” пад жыллё [2].

Наконт правага недакурка мы сказаць нічога не можам, бо не валодаем інфармацыяй пра віленскія тытунёвыя фабрыкі пач. XX ст.

На пытанне з'яўлення гэтых недакуркаў на гарышчы, мы можам толькі будаваць тэорыі: іх маглі таемна паліць, як выхаванцы прытулку ГДТ, так і афіцэры Вяцкага палка, якія, магчыма, займаліся нейкімі рамонтнымі працамі ў будынку. Бо вядома, што афіцэры гэтага палка ўсяляк дапамагалі ГДТ [9, арк. 141]. У сваю чаргу, некаторыя выхаванцы прытулка ГДТ адпраўляліся ў якасці вучняў у музыкальныя каманды розных вайсковых злучэнняў горада, у тым ліку і ў Вяцкі полк [9, арк. 142 адв.].




**Малюнак 4.** Дзве шкляныя аптэчныя бутэлечкі, верагодна, міжваеннага часу, знойдзеныя аўтарам. Фотаздымак аўтара.

*Дзве аптэчныя шкляныя бутэлечкі, міжваенны перыяд* (Малюнак 4). Левая бутэлечка мае блакітнаватае адценне. Даўжыня 10 см. Дыяметр донца – 3 см. Дыяметр бутэлечкі паступова пашыраецца, а ў верхняй частцы, дзе знаходзіцца "горлышка" – звужаецца. Маецца "носік", што сведчыць аб захоўванні ў такой бутэльцы лекаў у вадкім стане (напрыклад, капляў).

Правая бутэлечка мае цёмна-зялёны колер. Даўжыня – 7 см. Дыяметр донца – 2 см. У верхняй частцы, дзе знаходзіцца "горлышка", дыяметр звужаецца. Паводле супрацоўнікаў аптэкі-музея № 1 г. Гродна, у такой бутэльцы маглі захоўвацца лекі, як у вадкім стане (каплі), так і ў цвёрдым (таблеткі).

*Этыкетка з аптэкі Адамовіча, 1937–1939 гг.* (Малюнак 5). Папяровая этыкетка памерам 5 х 2,5 см, пясочнага колеру. Этыкетка аформлена па-мастацку: у вуглах ёсць выявы чатырох кветак з трыма пялёсткамі. Мае невялікія пашкоджанні (парванасці): у верхняй частцы пасярэдзіне і ўнізе злева. У верхняй частцы – надпіс па-польску: "Apteka FARNA ....amowicza / Grodno, Telefon, 97," (Фарная аптэка Адамовіча. Гродна, тэлефон, 97). Унізе таксама маецца надпіс на польскай мове: "dz. ED. STĘPNIEWSKI / Pl. Batorego № 8." (Эдвард Стэмпнеўскі, плошча Баторыя, 8).

У міжваенны час Фарнай аптэкай Адамовіча называлася сённяшняя аптэка-музей № 1 (пл. Савецкая, 4). Сям'я Адамовічаў валодала гэтай аптэкай з 1836 па 1881 гг., а наступныя ўладальнікі аптэкі ў знак пашаны пакінулі іх прозвішча ў яе назве. І

як бачым, нават у 1930-х гг., яна па-ранейшаму насіла назву былых уладальнікаў [1, с. 315].




**Малюнак 5.** Этыкетка ад лекаў з Фарнай аптэкі, 1937-1939 гг., знойдзена Жабінскім Паўлам. Фотаздымак аўтара.

Што тычыцца Эдварда Стэмпнеўскага (1879–1944 гг.), то ў часы Расійскай імперыі ён быў фармацэўтам і арэндаваў будынак Фарнай аптэкі (валодаў да 1915 г. і з 1918 па 1939 гг.) [11, с. 239]. Дарэчы, у траўні 1912 г. Стэмпнеўскі збіраўся купляць у Гродзенскага дабрачыннага таварыства яе аптэку (сёння будынак шахматна-шашачнага клуба на вул. Ажэшка, 15), але 16 траўня 1912 г., на паседжанні членаў праўлення ГДТ было вырашана перадаць аптэку канкурэнтам Стэмпнеўскага – правізарам Палякову і Савельеву [4, арк. 9].

Падчас Першай сусветнай вайны Э. Стэмпнеўскі быў у расійскім войску. Вяртаецца ў Гродна толькі ў 1918 г. З пач. 1920-х гг. займаецца палітычнай дзейнасцю і ў 1922–1927 гг. быў нават абраны на пасаду прэзідэнта г. Гродна. Быў сябрам выканаўчага камітэту па адбудове помніка Э. Ажэшка ў г. Гродна. Пры ягоным кіраўніцтве, у горадзе быў адчынены прыродазнаўчы музей С. Жыўны (сёння – будынак ветэрынарнага факультэта Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта па вул. Валковіча, 1), і адбыўся пераезд гістарычнага музея ў Стары замак [11, с. 239].

Станам на 1937 г. Э. Стэмпнеўскі жыў на плошчы Баторыя, 8. Гэта дазваляе нам звузіць год выпуску дадзенай этыкеткі: 1937 – верасень 1939 гг. Э. Стэмпнеўскі па-ранейшаму валодаў Фарнай аптэкай. У 1944 г. за падтрымку антынацысцкага падполля ён будзе арыштаваны і адпраўлены ў канцлагер Штутгаф. У якасці вязня пад № 34519 Эдвард Стэмпнеўскі памрэ ўсяго праз тыдзень пасля прыбыцця ў лагер [11, с. 240].

*Этыкетка з аптэкі Саўлы Шварца, міжваенны перыяд* (Малюнак 6). Папяровая этыкетка памерам 4,3 х 2 см, пясочнага колеру. Мае пашкоджанні: вырваны правы ніжэйшы вугал, і невялікая парванасць у цэнтры. Падпісана па-польску: “Apteka S. Szwarca / w GRODNIE / ul. Orzeszkowej № 11 / Kropie od bólu....” (Аптэка С. Шварца / у

Гродна / вул. Ажэшка, 11 / Каплі ад болю….).

Вядома, што Саўл Шварц нарадзіўся ў 1883 г., меркавана – у г. Беластоку. Меў спецыяльнасць фармацэўта. У г. Гродна – з 1914 г., дзе валодаў вышэйадзначанай аптэкай. Дарэчы, будынак былой аптэкі Шварца да сённяшняга дня захаваўся ў добрым стане пад тым жа адрасам (вул. Ажэшка, 11), і там зараз знаходзіцца Аптэка № 1 "Фармацыя г. Гродна". Станам на 1923 г. С. Шварц жыве разам з жонкай і трыма дзецьмі на 2-м паверсе будынка, якім тады валодала дабрачыннае таварыства "Жлобэк" (сёння – будынак на вул. Ажэшка, 15). На 1-м паверсе гэтага будынка ў трох пакоях займала ягоная аптэка [5, арк. 22–23]. Такім чынам, у міжваенны час Шварц валодаў аптэкамі, якія размяшчаліся ў двух будынках.




**Малюнак 6.** Этыкетка ад лекаў з аптэкі Саўла Шварца, міжваеннага часу, знойдзеная Кічынскім Раманам. Фотаздымак аўтара.

Дадзеныя этыкеткі нам паказваюць, што выхаванцам прытулку ПДТ куплялі лекі, як мінімум, з дзьвух прыватных аптэк: Стэмпнеўскага і Шварца. Лекі, як паказваюць знаходкі, маглі захоўвацца і ў будынку тагачаснага прытулка.




**Малюнак 7.** Папяровы фанцік ад цукеркі з фабрыкі А. Софера, пач. XX ст., знойдзены Кічынскім Раманам і Холадам Аляксеем. Фотаздымак аўтара.

*Папяровы фанцік ад цукеркі, пач. XX ст.* (Малюнак 7). Дадзены фанцік не цэльны, а парваны на 5 частак. Пры злучэнні можна прачытаць надпіс на рускай мове дарэвалюцыйнага правапісу: "КОНФ…ЕК.. / ф…бри… /

ОРѢХОВАЯ / карамель / А. СОФЕРА / въ Гроднѣ". З левага боку – манаграма "АС" – ад літараў імя і прозвішча ўладальніка. У цэнтры фанціка – малюнак двух лясных арэхаў з зялёным лісцем. Літары, манаграма і выява арэхаў зробленыя чырвонымі чарнiламі.

Дадзеная знаходка даказвае, што дзеці прытулка ГДТ у сваім рацыёне спажывалі кандытарскія вырабы. Верагодна іх давалі на рэлігійныя святы (Раство, Пасха), або на імяніны ці дні народзінаў асобных выхаванцаў прытулку ГДТ. Інфармацыю ж пра фабрыку Софера пакуль знайсці не ўдалося.

*Металічная крышка ад абутковага крэма, пач. XX ст.(?)* (Малюнак 8). Крышка акруглай формы, дыяметрам 5 см. Пафарбавана ў залацісты і чорны колеры. У цэнтры маюцца пагнутасці. Па краях крышкі – пацёртасці. Наверсе паўкругам ідзе надпіс залацістымі літарамі на чорным фоне па-англійску: "JACQUOT & C$^{O}$. FRENCH BLACKING" (Назва кампаніі. Французскі чорны). Унізе надпіс: "Paris / prepared by / JACQUOT & C$^{O}$" (Парыж / зроблены / назва кампаніі). Цікавасць прадстаўляе малюнак на крышцы. На ёй у цэнтры – выява вялікага чорнага бота, у які, нібыта ў люстэрка, глядзяць у сваё адлюстраванне малпа і папугай. Злева ад папугая – фігура задаволенага чалавечка, які прытанцоўвае на левай назе. Чалавечак трымае ў левай руцэ маленькі чорны бот, у правай – прадмет, падобны на абутковую шчотку. Такая выява павінна была рэкламаваць прадукцыю фірмы, пры прымяненні якой боты блішчалі нібыта люстэрка.




**Малюнак 8.** Металічная крышка ад абутковага крэма, пач. XX ст.(?), знойдзеная аўтарам. Фотаздымак аўтара.

Пошук інфармацыі пра гэтую фірму ў літаратуры нічога не даў. А інтэрнэт-крыніцы прапаноўваюць сайты розных аўкцыёнаў. На адным з такіх сайтаў прадстаўлены набор для абутка вышэйназванай фірмы, з датыроўкай 1875–1900 гг. [13]. Таму тэарэтычна дадзенай крышка магла быць зроблена ў пач. XX ст.

*Кавалак паперы, верагодна пач. XX ст.* (Малюнак 9). Звычайны кавалак паперы з вучнёўскага сшытка ў касую лінейку. Памеры: даўжыня верхняй часткі – 6,4 см,

ніжэйшай – 7,4 см, шырыня – каля 5 см. Мае надпіс на рускай мове дарэвалюцыйнага правапісу: “Воръ.”. Надпіс зроблены алоўкам. Літары нахіленыя ў правы бок. Паколькі надпіс дарэвалюцыйнага правапісу, то тэарэтычна ён мог быць датаваны пач. ХХ ст.



**Малюнак 9.** Кавалак паперы з надпісам “Воръ.”, верагодна, пач. ХХ ст., знойдзены аўтарам. Фотаздымак аўтара.

Аўтара і адрасата надпіса мы ўжо не даведаемся, таму застаецца будаваць толькі тэорыі аб тым, што такімі запіскамі маглі высвятляць адносіны выхаванцы прытулку ГДТ.

**Высновы.** Мы разгледзелі і прааналізавалі дзесяць цікавых знаходак з гарышча будынка на зав. Тэлеграфны, 2, г. Гродна. Тры з іх падпісаныя па-руску, тры – па-польску, адна – па-англійску. Знаходкі дазваляюць дапоўніць гісторыю дадзенага будынка і паказваюць, чым карысталіся, лячыліся, што маглі есці і паліць ягоныя былыя жыхары. Спадзяемся, што знаходкі знойдуць ганаровае месца ў музейным пакоі ДУА “ГАЦТіК”. А паколькі праца на гарышчы працягваецца, мы ўпэўненыя, што артыкул на такую тэматыку будзе не апошнім.

Аўтар шчыра дзякуе старшаму выкладчыку ГрДУ імя Янкі Купалы Гаршкову Алесю Дзмітрыевічу за прадстаўленае сіта і дапамогу на першым этапе; членам аб’яднання па інтарэсах “Археалогія” ДУА “ГАЦТіК”, якія з’яўляюцца таксама студэнтамі 1 і 2 курсаў спецыяльнасці “Археалогія” ГрДУ ім Я. Купалы: Казлову Севасцьяну, Кічынскаму Раману, Холаду Аляксею, Русецкаму Івану, Чубараву Мацвею, Харужыю Алегу; а таксама педагогу дадатковай адукацыі вышэйадзначанай установы і студэнту 4 курса спецыяльнасці “Айчынная і ўсеагульная гісторыя” Жабінскаму Паўлу Валер’евічу.

Без дапамогі гэтых людзей праца б шла ў разы павольней.

**Спіс крыніц і літаратуры:**

1. Вашкевіч, А. Біяграфія Гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы / А. Вашкевіч, А. Госцеў [і інш.]. – Гародня-Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2012. – 370 с.

2. Венский, В. Помните про две старинные казармы у сквера по улице Щорса в Гродно? Смотрите, как они будут выглядеть после реконструкции [Электронный ресурс] / В. Венский // Вечерний Гродно. – 2022. – Режим доступа: https://vgr.by/2022/10/08/pomnite-pro-dve-starinnyie-kazarmyi-u-skvera-na-ulice-shhorsa-v-grodno-smotrite-kak-oni-budut-vyiglyadet-posle-rekonstrukcii/ Дата доступа: 22.11.2023.

3. Гацко, Я. Гродзенскае і Польскае дабрачынныя таварыствы ў сярэдзіне XIX – пачатку ХХ стст. / Я.У. Гацко // Беларусь у

кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.), І. Ф. Кітурка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2021. – С. 268–272

4. Журнал паседжанняў праўлення Гродзенскага дабрачыннага таварыства за 1912 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). – Ф. 948. Воп. 1. Спр. 16. Арк. 9.

5. Пашпарты сядзібных участкаў, жылых дамоў і іншых пабудоў у г. Гродна па вул. Ажэшка у 1923 – 1924 гг. // ДАГрВ. – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 96. Арк. 22–23.

6. Пашпарты сядзібных участкаў, жылых дамоў і іншых пабудоў у г. Гродна па вул. Тэлеграфнай у 1923–1924 гг. // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (далей – ДАГрВ). – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 128. Арк. 8.

7. План г. Гродна за 1912 г. // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 11. Воп. 16. Спр. 2. Арк. 1.

8. Планы камлектавання дзіцячых дамоў і інтэрнатаў на 1960/1961 вучэбны год // ДАГрВ. – Ф. 730. Воп. 1. Спр. 709. Арк. 11.

9. Справаздачы аб дабрачынных таварыствах Гродзенскай губерніі за 1898 г. // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 18. Спр. 579. Арк. 141, 142 адв.

10. Технический паспорт на общественное здание (сооружение) : Регистрационное удостоверение № 5581 : принят 15.03.2001 / Министерство жилищно-коммунального хозяйства РБ. – Гродно : Бюро регистрации и технической инвентаризации, 2001. – 42 с.

11. Чарнякевіч. А. Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. / А.М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт. 2015. – 306 с.

12. Iberski, E. Plan miasta Grodna / E. Iberski. – Grodno: Nakład księgarni E. Iberskiego w Grodnie, 1932. – 21 s.

13. Jacquot & C$^{o}$. French Blacking Box with Shoemaker's Tools, 1875-1900 [Электроны рэсурс] // The Henry Ford – 2017. – Рэжым доступу: https://www.thehenryford.org/collections-and-research/digital-collections/artifact/462527/ – Дата доступу: 22.11.2023.

14. Jodkowski, J. Grodno / J. Jodkowski. – Wilno: księgarnia J. Zawadzkiego, 1923. – 120 s.

15. Państwowa Szkoła Zawodowa Żeńska w Grodnie. – Warszawa: Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego, 1929. – 4 s.

16. 102-й пехотный Вятский полк [Электроны рэсурс] // Офицеры русской императорской армии – 2023. – Рэжым доступу: https://ria1914.info/index.php/102-%D0%B9_%D0%BF%D0%B5%D1%85%D0%BE%D1%82%D0%BD%D1%8B%D0%B9_%D0%92%D1%8F%D1%82%D1%81%D0%BA%D0%B8%D0%B9_%D0%BF%D0%BE%D0%BB%D0%BA – Дата доступу: 22.11.2023.

**Навуковы кіраўнік** – доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры ўсеагульнай і славянскай гісторыі ГрДУ імя Янкі Купалы Нечухрын А. М.

# АД ВЫКЛАДЧЫКАЎ – СТУДЭНТАМ

УДК 902/904

## Чаму мы такія, якія мы ёсць? Рэцэнзія на «*Сапольски Р. Кто мы такие? Гены, наше тело, общество / Р. Сапольски : Пер. с англ. – М. : Альпина нон-фикшн, 2023. – 256 с.*»

**ГАРШКОЎ**
**Аляксандр Дзмірыевіч**



*Старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін*
*ГрДУ імя Янкі Купалы*
*Gorshkov_AD@grsu.by*

Пытанне "Адкуль узяўся чалавек і чаму менавіта мы зараз дамінуем на планеце Зямля?" цікавіць нас, пачынаючы са старажытных часоў. Аднак даследаванне гэтага перыяду толькі пры дапамозе археалогіі і яе інструментаў не дазваляе нам адказаць на гэтае пытанне. Дадзеная акалічнасць вымушае нас звяртацца да даных прыродазнаўчых навук і асабліва – біялагічнага накірунку, так як большасць дзеянняў, якія мы, альбо вы – будучыя археолагі, фіксуем паводле матэрыяльнай культуры, з'яўляюцца вынікам нашых прыродных задаткаў альбо эвалюцыйных дасягненняў.

Дадзеная кніга з'яўляецца рускамоўным перакладам працы Роберта Сапольскага, якая пабачыла свет у 2005 г. Важным з'яўляецца тое, што праца, якая была надрукавана выдавецтвам "Альпіна нон-фикшн" у 2023 г., мае навуковага рэдактара ў асобе кандыдата[1] біялагічных навук Юліі Аляксандраўны Краус, якая на момант напісання рэцэнзіі з'ўлялася супрацоўнікам кафедры біялагічнай эвалюцыі біялагічнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. І. Ламаносава.

Праца складаецца з заўваг аўтара, падзякаў, трох частак, якія ў сваю чаргу падзяляюцца на падчасткі. Кожная з іх сканчваецца нататкамі Р. Сапольскага і літаратурай, на якую навуковец спасылаецца або прапануе да яе звярнуцца дзеля паглыбленага вывучэння той ці іншай праблематыкі.

---

[1] На сайце кафедры біялагічнай эвалюцыі пададзена інфармацыя аб тым, што з 2021 г. Ю. А. Краус з'яўляецца доктарам біялагічных навук. Магчыма, пераклад кнігі рыхтаваўся раней, пагэтаму ў ёй пададзена неактуальная інфармацыя.

Як вышэй ужо было сказана, кніга пачынаецца з заўваг аўтара, у якіх гаворыцца аб публікацыі некаторых матэрыялаў у навуковых часопісах. Частка з гэтых артыкулаў была злёгку перапрацаваная. На наш пункт гледжання, гэты факт не з’яўляецца нейкім мінусам дадзенай работы, так як для студэнтаў, а верагодна, і для выкладчыкаў, падобныя працы наўрад ці былі або ёсць дасяжнымі.

Першая частка кнігі прысвечана пытанням генаў і хто мы такі. Пачынаецца яна з уводзін (як і кожная наступная) і складаецца з шасці падчастак.

У гэтай частцы аўтар спрабуе патлумачыць, што карэнным чынам уплывае на чалавека: выхаванне або прырода, праз артыкул у часопісе People, дзе вядомыя на той момант асобы разважалі, як яны патрапілі ў топ 50 самых прыгожых людзей свету. Аналізуючы гэтыя адказы і базуючыся на сваіх ведах, Р. Сапольскі тлумачыць, што нашыя гены ўплываюць на тое, як мы з вамі ўзаемадзейнічаем з навакольным асяроддзем [с. 22].

У другой падчастцы, якая мае назву “Ген проста так”, даследчык, праз прыклад авечкі Долі[2], паказвае на прарыў у даследаванні ДНК і ўплыў генаў на стан чалавека або жывёлы. На прыкладзе прымата, які атрымаў моцны стрэс праз адсутнасць ежы, Р. Сапольскі паказвае, што такія візуальныя змяненні таксама прасочваюцца і ў арганізме, напрыклад, праз выдзяленне гармону стрэса [с. 34].

Падобнай праблеме прысвечана і трэцяя падчастка, якая звязана са змяненнямі ДНК мышэй. Аднак тут істотна аўтар звяртае ўвагу на журналістаў, якія, як і ў выпадку з авечкай Долі, сваімі “сенсацыйнымі” адкрыццямі і “страшылкамі” замянялі навуковым даследаванням.




Наступныя дзве падчасткі распавядаюць нам пра працэс цяжарнасці, перадачы і фарміравання генаў, а таксама, унёсак даследаванняў на мышах для чалавека. На першы погляд, гэтыя тэксты маюць чыста біялагічны накірунак, але да нас, гісторыкаў і археолагаў, яны маюць непасрэднае дачыненне, а выраз “Иногда курица – это способ яйца

[2] Авечка Долі – першае ў гісторыі кланіраванае млекакормячае, якое з’явілася ў 1996 г. Пражыла жывёла да 2003 г.

создать новое яйцо" добра адлюстроўвае прычыны паўтаральнасці некаторых прыладаў працы [с. 56].

Вельмі, на наш пункт гледжання, цікавай, з'яўляецца апошняя падчастка першай часткі, якая прысвечана бацькоўскім якасцям і іх уплыву на наступнае патомства. Большасць з нас ведаюць, што ў прыродзе выбар самкай партнёра для спарвання залежыць ад афарбоўкі самца. Аднак праведзеныя даследаванні паказваюць, што ў асобін, якія маюць найбольш прываблівыя знешнія прыкметы, патомства мае лепшыя паказчыкі прыстасаванасці да навакольнага асяроддзя [с. 83–84].

Другая частка дадзенай кнігі мае назву "Наше тело и кто мы такие", у ёй разглядаюцца пытанні спецыфікі сну, кепскага настрою і паразітаў у мазгу. Агулам яна падзяляецца на сем падчастак.

Ва ўводзінах даследчык тлумачыць характар дадзенага блока, асноўная думка якога прасочваецца адразу: усе змяненні, якія адбываюцца ў арганізме ўплываюць на дзейнасць мозга і наадварот [с. 94]. Па факце, гэтаму і прысвечаны ўсе тэксты. Чаму мы бачым сны, як стрэс і больш змяняе нашыя паказчыкі ў мозгу і агулам – гармонаў і г.д. Найбольш, на наш пункт гледжання, цікавай, з'яўляецца апошняя падчастка, у якой аўтар раскрывае, як некаторыя праблемы бацькоў калечаць жыцці дзяцей (прамым чынам).

Трэцяя, заключная частка кнігі, прысвечана грамадству і ролі/месцу нас, як людзей, у яго сістэме. Складаецца яна з сямі падчастак, якія адлюстроўваюць нашыя адносіны да сваіх суродзічаў, навакольнага асяроддзя і г.д.

Уводзіны Р. Сапольскі пачынае з расповеду аб гісторыі сваёй сям'і, згодна з якой, усе яе галіны мігравалі паміж 1905 г. і Першай сусветнай вайноў у Амерыку з тэрыторыі Расіі[3] [с. 177]. І задаецца пытаннем, што было б, каб яго продкі засталіся: ці пагарджаў бы ён Брэжневым, як Ніксанам, ці ўвогуле не стаў бы вучоным.

Галоўнай лініяй дадзенай часткі з'яўляецца ўплыў культуры на чалавека, у тым ліку, яго біялагічны складнік. Напрыклад, даследчык адзначае, што істотным чынам на здароўе чалавека ўплывае яго дабрабыт, то бок – даступнасць рэсурсаў. А іх адсутнасць запускае стрэс ад беднасці, які не лепшым чынам адбіваецца на людзях [с. 184–185].

З пункту гледжання археалогіі цікавай з'яўляецца

[3] У Вікіпедыі падаецца іншая інфармацыя – што Р. Сапольскі з'яўляецца сынам савецкага эмігранта. Калі верыць інфармацыі аўтара і ўлічыць, што ён яўрэй па паходжанні, то яго продкі маглі паходзіць з тэрыторыі сучаснай Беларусі.

падчастка, прысвечаная культурным асаблівасцям розных тэрыторый. Па факце, яна распавядае пра ўплыў экалогіі на чалавека і яго наваколле. Падаецца кароткі гістарыяграфічны агляд дадзенай думкі, у тым ліку, праз негатыўнае стаўленне да расізму, які бытаваў у першай палове XX ст. [с. 199–200]. Р. Сапольскі звяртае ўвагу на культурныя адрозненні насельніцтва тундры, пустыні і дажджавых лясоў. На яго думку, менавіта гэтыя асаблівасці сталі асновай для з'яўлення розных рэлігій і самае галоўнае – розных генетычных асаблівасцей.

У чацвёртай і пятай падчастках навуковец паказвае нам спосаб рэканструкцыі стасункаў людзей праз прызму жывёльнага свету і тэорыі гульняў. Апошняя вельмі цікавая для даследавання першабытнай гісторыяй, так як многімі заходнееўрапейскімі даследчыкамі разглядаецца ў якасці асновы стасункаў чалавека на любых стадыях развіцця.

Апошняя падчастка кнігі прысвечана культурным асаблівасцям развіцця людзей, у тым ліку, праз прызму ўласнага досведу даследчыка.

Агулам, дадзеная праца выклікае, пераважна, дадатковыя эмоцыі. Па-першае, яна незвычайная для прачытання, так як напісана (тут трэба адзначыць добрую рэдактарскую працу) – у т.зв. заходнееўрапейскім стылі.

Плюсам дадзенай кнігі можна безумоўна адзначыць вялікую колькасць спасылак на эксперыменты (часам, не зусім этычныя з сучаснага пункту гледжання, праўда, пра што аўтар нам піша), якія пацвярджаюць або абвяргаюць пэўныя палажэнні.

Мінусам можна назваць малую колькасць спасылак на даследаванні археолагаў у кантэксце звароту да старажытнасці. Напрыклад, пры выкарыстанні даных аб краманьёнцах і неандэртальцах, Р. Сапольскі спасылаецца на Д. Даймонда як фізіёлага [с. 252]. На наш пункт гледжання, у такіх пытаннях, усё ж такі варта звяртацца да навукоўцаў, якія непасрэдна даследуюць гэтую праблематыку прамым чынам.

Падсумоўваючы ўсё вышэйсказанае, можна зрабіць выснову, што дадзеная кніга вартая прачытання і безумоўна, пашырыць кругагляд студэнтаў на некаторыя праблемы, звязаныя з чалавекам і яго развіццём, як біялагічнага віда.

**Спіс крыніц і літаратуры:**

1. Сапольски Р. Кто мы такие? Гены, наше тело, общество / Р. Сапольски : Пер. с англ. – М. : Альпина нон-фикшн, 2023. – 256 с.

# СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

## Студенческая научно-практическая конференция *«Время истории – время историка»*, посвящённая 50-летию кафедры всеобщей и славянской истории (28 ноября 2023 г.)

**ГЛАДКОВСКИЙ**
**Иван Юрьевич**



*Студент 1 курса*
*ГрГУ имени Янки Купалы*
*ivangladkovsky@tut.by*

28 ноября 2023 года прошла конференция “Время истории – время историка”, посвященная 50-ти летию кафедры всеобщей и славянской истории, факультета истории коммуникации и туризма. В этой конференции было представлено четыре секции по направлениям: “Отечественная история”, “Всеобщая история”, “Археология” и “Историческая память и коммеморативные практики”. Живой интерес у студентов вызвала секция № 3 “Археология”, в которой было представлено девять работ на различные темы, начиная от истории исследования Месопотамии, заканчивая исследованиями кожевенного дела.

Председателем секции выступил беларуский археолог, кандидат исторических наук, преподаватель кафедры истории Беларуси, археологии и специальных исторических дисциплин Горшков Александр Дмитриевич. Секретарем секции была студентка третьего курса Радикевич Оксана Олеговна. Участники конференции принимали активное участие в обсуждении работ своих коллег, учитывали замечания внесённые председателем и секретарем секции.

Уникальность этого мероприятия заключалась также в том, что работы предоставили студенты всех курсов, участие принимали студенты, обучающиеся не только по специальности “История”, среди них представители специальности “Правоведение”, “Журналистика” “Графический дизайн”, “Информационно-измерительные приборы и системы”, “Информация и коммуникация”. Данная конференция вызвала интерес не только у студентов, но и учащимися учреждений получения среднего образования. Одним из участников конференции стала учащаяся Гимназии № 9 им. Ф. П. Кириченко г. Гродно, Крупенич Анна Ивановна, выступившая с докладом “Кожевенное дело на территории Беларуси в период средневековья”.

В секции “Археология” было выслушано 9 докладов. В основном доклады были подготовлены для дальнейшего написания курсовых работ, работ по схожей тематике.

Всё доклады вызвали живой интерес, об этом можно судить по тому что обсуждалось каждое выступление, задавались интересующие вопросы по темам.

Первым выступал Белоголовый Юрий Андреевич, студент 3 курса с темой “Начало исследований советских археологов в Месопотамии: экспедиция в Ираке в 1969–1985 гг”. участники конференции могли послушать об исследователях данного периода, познакомиться с фотографиями находок и самой экспедиции.

Вторыми докладчиками были Гладковский Иван Юрьевич, студент 1 курса и Крупенич Анна Ивановна, учащаяся Гимназии № 9 со статьей “Кожевенное дело на территории Беларуси в период средневековья”. Можно было узнать о проблемах изучения кожевенного дела, посмотреть фотографии различных интересных находок.

Жабинская Светлана Сергеевна, студентка 3 курса подготовила доклад на тему “Мезалітычныя матэрыялы з археалагічнай экспазіцыі факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Янкі Купалы”. Студенткой была проделана работа по изучению данных ей материалов. Также была поднята проблема изучения мезолитических памятников.

Жабинский Павел Валерьевич, студент 4 курса “Крамянёвыя матэрыялы ў калекцыях помнікаў з ваколіц в. Малоткавічы Пінскага раёна”. В этом докладе была показана полевая работа археолога. Были представлены свежие исследования археологических памятников.

Радикевич Оксана Олеговна, студентка 3 курса рассказала про “Шпильки железного века с территории бассейна Белорусского Повилья: к 95-летию со дня рождения Ярослава Генриховича Зверуго”. Эта работа была интересна ещё и тем что в она была посвящена белорусскому археологу Я. Г. Зверуго и его классификации шпилек железного века.

Русецкий Иван Алексеевич, студент 2 курса специальности “История (археология)”, “Технико-морфологическая характеристика геометрических микролитов эпохи мезолита на территории Белорусского Поозерья”

Всё выслушаное было очень познавательным, однако, наиболее интересными в секции были признаны выступления Каспера Никиты Сергеевича “Вклад Лидии Ивановны Тегако в развитие современной белорусской антропологии” и Чубарова Матвея Владимировича “Железные ножи с острова Замок на озере Дрисвяты в музейной коллекции ГрГУ им. Янки Купалы”.

В ходе всеобщего обсуждения лучшим был признан доклад Чубарова Матвея Владимировича, поэтому главный приз секции был отдан ему.

Подводя итог прошедшей конференции можно сказать, что археологическая наука вызывает всё больший интерес у студентов в плане написания научных статей, потому как “Археология” была выделена в отдельную секцию. Конференция дала всем возможность выступить, поделиться наработками и обсудить их. Материалы конференции войдут в отдельный электронный сборник с которым также можно будет ознакомиться в ближайшее время.

**Научный руководитель** – доктор исторчиеских наук, доцент, профессор кафедры истории Беларуси, археологии и специальных исторических дисциплин ГрГУ имени Янки Купалы Пивоварчик С. А.

АРХЕАЛАГІЧНЫ ГУРТОК

FACTA SUNT
VERBIS DIFFICILIORA